Converted by Total Image Converter - (no stamps are applied by registered version)

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ
НАВУК БЕЛАРУСІ

**Дзяржаўная навуковая ўстанова**
**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ**

вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск
Тэл./факс (017) 284 18 70
E-mail ii@history.by

НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ
НАУК БЕЛАРУСИ

**Государственное научное учреждение**
**ИНСТИТУТ ИСТОРИИ**

ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск
Тел./факс (017) 284 18 70
E-mail ii@history.by

31.01.2014 № 352-01-16/102
На № ___________ от _________

Макаву А.У.
Сябру рады ГА
“Хрысьціянская злучнасць Курапаты”

Ваш зварот на імя Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь М.У. Мясніковіча ад 18.01.2014 г. разгледжаны ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Зоны аховы матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай каштоўнасці “Месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій (1930-я – 1940-я гг.) ва ўрочышчы Курапаты Мінскага раёна” вызначаны Пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 12.05.2004 г. № 15.

У 2013 г. у паўночнай і ўсходняй частках ахоўнай зоны гісторыка-культурнай каштоўнасці Курапаты археолагамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі былі праведзены маштабныя комплексныя археалагічныя работы з мэтай магчымага выяўлення раней няўлічаных аб’ектаў. Падчас даследаванняў (раскопак) на плошчы звыш 6500 кв.м. археалагічных артэфактаў, новых аб’ектаў, пахаванняў, костных парэшткаў, слядоў знішчэння вопраткі і асабістых рэчаў рэпрэсаваных, гільз і куль стралковай зброі не выяўлена.

На пасяджэнні Навукова-метадычнай рады па пытанннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь 27.11.2013 г. быў разгледжаны праект зоны аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці “Месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій (1930-я – 1940-я гг.) ва ўрочышчы Курапаты Мінскага раёна”. Распрацоўшчыкам і аўтарам дакумента з’яўляецца архітэктар-рэстаўратар В.В. Гліннік.

Паведамляем, што ў Інстытуце гісторыі АН Беларусі з 1991 па 1995 гг. у рамках аддзела грамадска-палітычнай гісторыі Беларусі савецкага перыяду функцыянавала навуковае падраздзяленне – група па вывучэнні неабгрунтаваных рэпрэсій па палітычных матывах у Беларусі 1930-х – пачатку 1950-х гадоў. Па выніках праведзеных даследаванняў быў апублікаваны шэраг навуковых артыкулаў і прац па вывучаемай праблеме, у тым ліку манаграфія А.П. Урублеўскага і Т.С. Процькі “З гісторыі рэпрэсій супраць беларускага сялянства, 1929 – 1934 гг.” (Мінск: Навука і тэхніка, 1992).

Даследаванні па акрэсленай праблемы ажыццяўляюцца сёння ў аддзеле гісторыі беларускай дзяржаўнасці Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Падрыхтаваны планавы тэкст “Рэабілітацыя 1950 – 1990-х гадоў: асноўныя тэндэнцыі і этапы”, аспекты палітычных рэпрэсій савецкага перыяду знайшлі адлюстраванне ў 2-й кнізе калектыўнай манаграфіі “Гісторыя беларускай

Converted by Total Image Converter - (no stamps are applied by registered version)

дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.” (Мінск: Беларуская навука, 2012).

Навуковая распрацоўка праблемы працягваецца ў межах выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. “Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава”.

Дырэктар інстытута В.В. Даніловіч

Кошман, 2840513;
Несцяровіч, 2842555